УДК 2-29:37.01

**Н. В. Баршчэўская**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 1
г. Баранавічы імя С. І. Грыцаўца», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ЖЫЦЦЁ АФАНАСІЯ ФІЛІПОВІЧА ЯК ПРЫКЛАД ПРАВАСЛАЎНАГА ПАДЗВІЖНІЦТВА Ў ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫМ ВЫХАВАННІ ШКОЛЬНІКАЎ

**Уводзіны.** Лёс нацыі шмат у чым вызначаецца адукацыяй і выхаваннем, якое атрымлівае падрастаючае пакаленне з самага юнага ўзросту. Зварот да глыбінных каранёў асветы, да яе паходжання адкрывае нам высокі багаслоўскі сэнс гэтага паняцця.У сувязі з гэтым хочацца ўзгадаць словы незабыўнага Мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева): “Мы шмат разважаем і гаворым пра тое, як правільна выхаваць разумных і добрых дзяцей, як лепш укласці ў маладыя розум патрэбныя і карысныя веды. Навучаючы нашых дзяцей асновам навук і павышаючы ўзровень сваіх ведаў, мы добра робім. Але калі мы не дбаем пра сумленне і пра такія асноватворныя каштоўнасці сусветнай цывілізацыі, як любоў да Бога і любоў да бліжняга, — мы далёкія ад ісціннага разумення таго, што ёсць адукаваны чалавек” [16].

Сапраўды, спрадвеку працэс асветы быў прызначаны служыць высокай мэце дасягнення гармоніі духа, душы і розума. Менавіта ў такім стане пачынаецца вяртанне чалавека да вобраза Божага, які у кожным з нас закладзены і чысціня якога страчана пасля грэхападзення.

**Асноўная частка.** Зазірнуўшы ў гісторыю, мы ўпэўнімся, што ўся еўрапейская навука непарыўна звязана з хрысціянствам, царквой і манастырамі. З пачатку сярэдніх вякоў менавіта манахі былі практычна адзінымі адукаванымі людзьмі. Пры манастырах былі скрыпторыі, бібліятэкі, куды аддавалі на навучанне дзяцей. Першыя школы і ўніверсітэты таксама сфарміраваліся ў манастырскіх сценах [6]. На Беларусі Праваслаўная Царква таксама была калыскай адукацыі.

Навучаючы і выхоўваючы дзяцей, нашы продкі імкнуліся перш за ўсё да фарміравання ў іх вобраза Божага, які прысутнічае ў кожным чалавеку. З пакалення ў пакаленне хрысціянскія каштоўнасці былі прыярытэтнымі ў выхаванні. Нездарма цярплівасць, разважлівасць, пакорлівасць, сталі лічыцца нашымі беларускімі нацыянальнымі рысамі характару.

Сёння мы маем вялікі скарб: вопыт хрысціянскага выхавання больш чым з тысячагадовай гісторыяй. А таксама прыклады праведнага жыцця беларускіх святых, якія былі сапраўднымі светачамі, соллю зямлі беларускай, яе святлом, розумам, гонарам і сумленнем [9].

Праваслаўныя праведнікі нашых земель — гэта моцнае карэнне, на якім трымаецца душа нашага народа. Нашы святыя пакінулі нам прыклады стойкасці веры, мудрасці, мужнасці і справядлівасці. Іх духоўныя подзвігі даюць нам сілы для пераадолення самых цяжкіх выпрабаванняў. Нашы святыя асабліва блізкія нам, так як блізкія нам нашы родзічы. Бо мы — дзеці адной зямлі. Мы жывём там, дзе жылі яны, молімся там, дзе маліліся яны. Мы неадлучна звязаны адзін з адным, з нашымі продкамі, і з нашымі будучымі патомкамі. Ад нашых святых Угоднікаў Божых нам засталася багатая спадчына — іхні каштоўны духоўны вопыт. Маючы бессмяротную душу, беларускія святыя нябачна прысутнічаюць разам са сваім народам, дапамагаюць нам зберагаць веру бацькоў [7]. Нябесныя заступнікі ахоўваюць нас ад бед, якія не раз выпадалі на долю Праваслаўя на нашай зямлі. Больш за тысячагадовы шлях быў складаным, поўным ганенняў і прыцясненняў. Праваслаўная вера на тэрыторыі сучаснай Беларусі не раз стаяла пад пагрозай знікнення.

З канца 10 стагоддзя нашы продкі будавалі жыццё на аснове Праваслаўнага веравызнання. Яны дасягнулі вялікіх вяршынь у духоўнай і матэрыяльнай культуры, стварылі свае народныя традыцыі, шанавалі сваю высокаразвітую мову. Але гэта становішча змянілася пад час аб’яднання Вялікага Княства Літоўскага і Польскай Кароны ў адну дзяржаву — Рэч

© Баршчэўская Н. В., 2024

Рэпазіторый БарДУ

Паспалітую. Пры падтрымцы каталіцкага Рыма пачалася палітыка апалячвання і акаталічвання беларусаў. У 16 стагоддзі Праваслаўная царква на нашых землях апынулася фактычна па-за законам. Старабеларуская мова паступова выцяснялася з судовага і дзяржаўнага справаводства. А ў канцы 17 стагоддзя яе выкарыстанне як афіцыйнай і пісьмовай мовы ўвогуле было забаронена. Менавіта з таго часу насельніцтву пачало насаджацца негатыўнае, зневажальнае стаўленне да ўсяго беларускага. У першую чаргу да беларускай мовы. Яе сталі называць «мовай хамскай, мужыцкай". Польская мова лічылася мовай вышэйшага гатунку, панскай, шляхетнай. Беларуская знаць пакінула сваю царкву і перайшла ў касцёл, дзе хутка згубіла сваю нацыянальную самаідэнтыфікацыю. Пераход у каталіцызм і этнічнае рэнегатства сярэдневяковай эліты адыгралі ў выніку значную ролю ў аслабленні палітычнай, інтэлектуальнай і эканамічнай моцы беларусаў.

Працэс адрачэння ад роднай мовы і роднай веры прыняў катастрафічныя памеры пасля заключэння Берасцейскай уніі 1596 г. У выніку прыняцця уніі Праваслаўная царква Рэчы Паспалітай стала грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквой. Прызнавалася вяршэнства для ўніятаў папы рымскага і асноўных дагматаў каталіцтва. Уніяцкае духавенства аднолькава з каталіцкім вызвалялася ад падаткаў. Уніяцкая шляхта і мяшчане ўраўноўваліся ў правах з каталікамі. Праваслаўная шляхта, свяшчэннікі, мяшчанства страцілі магчымасць займаць пасады ў дзяржаўных органах улады. У выніку большасць праваслаўных епіскапаў перайшлі ва ўніяцтва. Праваслаўная царква ў Вялікім Княстве Літоўскім як кананічнае цэлае перастала існаваць. Пачалося змаганне з уніятамі за храмы і манастыры. Заключэнне царкоўнага саюза з Рымам сустрэла моцнае абурэнне праваслаўных. Гвалтоўнае навязванне уніі выклікала супраціўленне з боку сялян, мяшчан, членаў праваслаўных брацтваў. Не прынялі унію многія праваслаўныя шляхціцы. Справа даходзіла да адкрытых выступленняў. Так, у 1623 г. у Віцебску ў час хваляванняў праваслаўнага насельніцтва быў забіты полацкі ўніяцкі архіепіскап Іасафат Кунцэвіч, якога за жорсткасць празвалі «душахватам». Ва уніяцтва беларусы заганяліся сілком. Польскае кіраванне прымяняла сапраўды езуіцкія метады: ад запалохвання да эканамічнага шантажу. Праваслаўе проста вытраўлялі з беларусаў. Шмат хто змушаны быў падпарадкавацца. Але былі тыя, хто засведчыў непахіснасць бацькоўскай веры. Яны актыўна выступалі за захаванне чысціні Праваслаўнага вучэння, богаслужэння і царкоўнага кіравання. Сярод іх быў ігумен дзвух Берасцейскіх праваслаўных манастыроў Афанасій Філіповіч.

Ён нарадзіўся каля 1597 г. ў сям'і небагатага набожнага рамесніка. Атрымаў добрую адукацыю, валодаў некалькімі замежнымі мовамі. Што дазволіла яму 7 гадоў праслужыць хатнім настаўнікам у канцлера Льва Сапегі. Як потым высветлілася, Афанасій вучыў «лжэцарэвіча маскоўскага» — самазванага прэтэндэнта на царскі пасад. Не жадаючы быць удзельнікам палітычных інтрыг, Афанасій Філіповіч ва узросце 30 гадоў пастрыгся ў манахі ў Віленскім Свята-духавым манастыры. Малады інак Афанасій вылучаўся строгім выкананнем усіх паслушэнстваў і аскетычным прыкладам жыцця. Тры гады Афанасій у сане іераманаха ўзначальваў Дубайскі манастыр каля Пінска. Але Альбрэхт Радзівіл перадаў гэты манастыр на карысць іезуітам. Філіповіч атрымаў пасаду намесніка ігумена ў Купяцічах, таксама на Піншчыне. Менавіта там Афанасій сустрэў сваю пуцяводную зорку на шляху абароны Праваслаўя — цудадзейны абраз Божай Маці Купяціцкай. Абраз "малы памерамі, але вялікі цудамі" — напісаны ўнутры крыжа, некалі спалены татарамі, а пасля цудоўна з'яўлены сярод полымя.

Не толькі малітваю, але і справаю хацеў Афанасій служыць Богу. Усведамляючы бяспраўнае і зняважанае становішча Праваслаўнай царквы ў Польскай дзяржаве, святар вырашыў прасіць дапамогі ў набожнага цара Міхаіла Фёдаравіча Раманава. Восенню 1637 года ён пакінуў манастырскую келлю і рушыў пад выглядам збора міласціны ў Маскву. Шлях стаўся пакручастым і небяспечным. Адносіны Вялікага Княства Літоўскага і Масковіі ў той час былі напружанымі. Але Афанасія вёў і абараняў Купяціцкі цудатворны абраз Божай Маці. З вялікай цяжкасцю нястомны манах трапіў на прыём да цара. У яскравых фарбах намаляваў Філіповіч дзяржаўцу прыгнечаны стан праваслаўных, імкнуўся пераканаць яго ў неабходнасці ваеннага ўмяшання ў справы Рэчы Паспалітай [17].



Рэпазіторый БарДУ

Візіт да цара Філіповіч апісаў у сваім першым публіцыстычным творы “Гісторыя падарожжа ў Маскву”. Пасля вяртання з Масквы са шчодрымі царскімі ахвяраваннямі ў 1640 годзе Афанасій стаў ігуменам Сімяонаўскага манастыра ў Бярэсці. І гэты манастыр у XVII—XVIII ст. стаў найважнейшым цэнтрам апазіцыі польска-каталіцкім уладам і цэнтрам антыуніяцкай барацьбы на ўсёй «Старой Русі» [5].

Пад час ігуменства Філіповіч усердна расшукваў даўнія прывілеі на зямельнае забеспячэнне Праваслаўных цэркваў і манастыроў. У знойдзеных ім дакументах утрымліваліся страшэнныя пракляцці на адступнікаў ад веры Праваслаўнай. Ігумен абвяшчаў змест гэтых дакументаў у цэрквах і іншых грамадскіх месцах. За сваю праўду Афанасій стаў ненавісны ворагам Праваслаўя, быў гнаны і зняважаны. Праўду ён асмельваўся выказваць нават каралю Уладзіславу Вазе на дзяржаўным сойме 1643 года, куды ён адправіўся, заручыўшыся падтрымкай Божай Мацеры, Яе Купяціцкай цудатворнай іконай. Берасцейскі ігумен не толькі патрабаваў ад караля скасавання уніі, але і пагражаў каралю Божым гневам у адваротным выпадку. Дзёрзкасць Афанасія мела поспех: дзяржаўца аддаў загад задаволіць просьбу праваслаўных. Але вышэйшыя ўлады абвінавацілі ігумена ў самавольстве і пазбавілі сану. Ігумена абвясцілі вар’ятам і пасадзілі ў вязніцу. У адказ на гэта Філіповіч збег і , знямогшыся адшукаць праўды, паспрабаваў ўжыць такі сродак, як юродства. Б’ючы сябе кіем, ён бегаў па Варшаве з крыкамі: «Бяда праклятым і няверным!” [3]. За што зноў трапіў за краты. На гэты раз толькі заступніцтва кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы вярнула яму волю і ігуменства ў манастыры. Не было спакою для Філіповіча і за манастырскай агароджай. Манастыр неаднаразова падвяргаўся нахабным нападкам буйных іезуіцкіх студэнтаў і уніяцых святароў. Ігумен падрыхтаваў новае прашэнне каралю і ужо сабраўся ехаць на сойм. Але не паспеў — быў арыштаваны польскімі уладамі як палітычна неблаганадзейны за выдачу тайны самазванага «маскоўскага царэвіча». Пасланні каралю на сойм 1645 года ў абарону Праваслаўя ўжо не мелі поспеху, дзякуючы інтрыгам польскіх сенатараў і каталіцкага духавенства. Па каралеўскім наказе непакорлівага манаха замыкаюць ў Кіева-Пячэрскім манастыры.

Так, 40-я гады 17 стагоддзя для Афанасія Філіповіча прайшлі пад знакам вязніцтва. Але святар не адчайваўся. У манастыры ён склаў зборнік сваіх артыкулаў — «Дыярыуш». Дзённік душы, сведчанне шчырага змагання святара за праўду. «Дыярыуш» лічыцца сёння адным з шэдэўраў старадаўняй беларускай літаратуры. У ім не толькі ўспаміны аўтара, але і выкрывальныя прамовы, і багаслоўскія думкі, і гарачая палеміка. Даследчыкі выказваюць меркаванне, што менавіта ў “Дыярыушы” Афанасія Філіповіча ляжаць вытокі дакументалізму, спавядальнасці і вытанчанасці форм сучаснай беларускай прозы [12]. Аўтар сабраў пад аднной вокладкай пражытае і перадуманае, перадаў свой духоўны набытак. Свае дзеянні ў царкве ён апраўдваў тым, што яго поўнілі пачуцці спагады, імкненне абараніць «церковь правдивую» ад «кривды». Афанасій хацеў давесці, што ўсё, што ён чыніў, рабілася для Бога. Таму пра “Дыярыуш” ён напісаў, што гэта: “…апісанне праўдзівых падзей у справе памнажэння і вытлумачэння веры праваслаўнай… для людзей праваслаўных, якія хочуць пра тое цяпер і ў будучыя часы ведаць” [3].

Воляй лёсу Афанасій Філіповіч стаў апошнім беларускамоўным пісьменнікам. Пісьменства ў нашай мове перарвалася амаль на 2 стагоддзі. Пасля смерці Ўладзіслава 4 пачалася эпоха бескаралеўя і залаты век старабеларускай дзяржавы патануў ва ўнутраным разладзе, нязгодах і войнах. На свабоду Афанасій выйшаў толькі на пачатку 1647 года. Ён вярнуўся ў свой манастыр у Бярэсці, дзе і сустрэў сваю пакутніцкую смерць. 5 верасня 1648 года ён быў расстраляны польскімі гайдукамі па абвінавачванні ў сувязі з антыуніяцкім паўстаннем Б. Хмяльніцкага. Ігумен вытрымаў катаванні агнём, але не адмовіўся ад поглядаў: «Што я прамаўляў, ад таго не адракуся. З тым і смерць прыму…» [3].

Перад смерцю святар прадрок праследаванне Праваслаўнай царквы, але пасля і яе росквіт: «Там, дзе цела маё зраненае і скрываўленае за імя Божае пакладзена будзе, вера Праваслаўная заквітнее, як іскра ў попеле закапаная, явіцца, заззяе і паўсюль засвеціць» [3].

Зрэшты, так і сталася. Толькі праз доўгі і цярністы шлях Праваслаўная царква заняла свае адметнае і годнае месца ў духоўным жыцці Беларусі. А апантаны змагар за яе —

Рэпазіторый БарДУ

святы прападобнамучанік Афанасій Філіповіч — стаў адным з нябесных заступнікаў нашай зямлі. Яго жыццё — высокі прыклад для ўсіх нас, як належыць жыць у гэтым свеце і любіць сваю Радзіму. Як мужна стаяць за веру Хрыстову і будаваць жыццё на моцным падмурку веры Праваслаўнай.

Каштоўныя астанкі святых машчэй Афанасія Філіповіча нятленна спачываюць у Свята-Сімяонаўскай царкве Брэста, збіраючы да сябе шчырых багамольцаў. Адлюстроўваюць святога звычайна ў манаскім уборы каля стала з разгорнутай кнігаю. У руцэ яго пальмавая галіна (сімвал мучаніцтва), а на сцяне келлі — Купяціцкі цудатворны абраз Божай маці. Ушанаванне памяці прападобнага Афанасія Брэсцкага адзначаецца Праваслаўнай царквой двойчы: 5 верасня (у дзень смерці) і 20 ліпеня (у дзень здабыцця мошчаў). Па малітвах святых нашай зямлі і ўсіх вядомых Богу падзвіжнікаў, зараз Брэсцкая зямля — самы праваслаўны рэгіён рэспублікі. Высокую місію богаслужэння і благавесця ў Брэсцай вобласці нясуць мноства храмаў і манастыроў. Статыстыка сведчыць: на Брэстчыне — самая высокая нараджальнасць сярод іншых рэгіёнаў Беларусі. І гэта зусім не выпадкова — моцныя карані спрадвечных сямейных каштоўнасцей неадлучныя ад Праваслаўнага веравызнання [15].

**Заключэнне.** Промысел Божы, стойкасць у веры простага народа і мучаніцтва яго святых падзвіжнікаў захавалі традыцыі старажытнай Праваслаўнай набожнасці. Яны жывуць і сёння. Ад нас залежыць — ці зможам мы зразумець гэтыя духоўныя урокі, захаваць і перадаць дзецям нашу духоўную спадчыну — Праваслаўную веру нашых продкаў. Задача сям'і, школы, Царквы — агульнымі намаганнямі выхаваць чалавека, дастойнага свайго вышэйшага прызвання. Выхаваць на гераічных прыкладах жыцця лепшых асоб нашай гісторыі.

Менавіта да такой высокай мэты зроблены першыя сціплыя крокі супрацоўнікамі нашай бібліятэкі сярэдняй школы №1 імя С. І. Грыцаўца ў бягучым навучальным годзе. Побач з нашай навучальнай установай у мікрараёне Бараўкі будуецца Храм Святой блажэннай Валянціны Мінскай. Сумесна з настаяцелем Храма айцом Антоніем мы распачалі цыкл праваслаўных асветніцкіх мерапрыемстваў па духоўна-маральнаму выхаванню школьнікаў. Першая сустрэча прайшла з шасцікласнікамі і выклікала жывую непадробную зацікаўленнасць вучняў. Аповяд настаяцеля аб святых людзях нашай зямлі з далёкай мінуўшчыны вучні слухалі, затаіўшы дыханне. Відавочна, што сапраўдныя святасць, духоўная прыгажосць захапляюць дзяцей, абуджаюць у іх імкненне да чысціні і самадасканаласці. Прасвятляючы тым самым закладзенае у іх Божае святло. Маем шчырую надзею, што распачатыя сумесныя намаганні па духоўнаму выхаванню нашых дзяцей будуць мець плён. І часцінкі Божага святла ў дзіцячых душах будуць паступова памнажацца, як памнажаюцца цаглінкі ў сценах нашага Храма.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Архіпастыры з пяці краін прынялі ўдзел у святкаванні дня памяці прападобнамучаніка Афанасія Брэсцкага [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://church.by/by/news/arhipastyri-iz-pjati-stran-prinjali-uchastie-v-prazdnovanii-dnja-pamjati-prepodobnomuchenika-afanasija-brestskogo/ . — Дата доступу: 05.11.2023.
2. Асветнікі зямлі беларускай, X — пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларус. энцыкл., 2001. — 492 с.
3. Афанасій Філіповіч. Дыярыуш [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://sppsobor.by/bractva/vilna/publish/belcalendar/5316/ . — Дата доступу: 26.10.2023.
4. Берасцейская унія 1596 [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1292151042&archive=1293199280&start_from=&ucat=&– Дата доступу: 29.10.2023.
5. Берестейский православный мужской монастырь Преподобного Симеона Столпника: обзорная статья [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.obitel-brest.by/ . — Дата доступа: 04.11.2023.
6. *Данилова, А.* Святые и светское образование [Электронный ресурс] / А. Данилова. — Режим доступа: https://www.pravmir.ru/svyatye-i-svetskoe-obrazovanie/ . — Дата доступа: 04.11.2023.
7. Духовность и патриотизм: факультативные занятия «Основы духовно-нравственной культуры и патриотизма»: 6-й (7-й) кл. : пособие для учащихся учр. общ. среднего образования с белорус. и рус. яз. обучения : в 2 ч. / Ф. П. Повный [ и др.]. — Мінск : Адукац. і выхаванне, 2022. — Ч. 1. — 148 с.

8. Духовность и патриотизм: факультативные занятия «Основы духовно-нравственной культуры и патриотизма»: 6-й (7-й) кл. : пособие для учащихся учр. общ. среднего образования с белорус. и рус. яз. обучения : в 2 ч. / Ф. П. Повный [ и др.]. — Минск : Адукац. і выхаванне, 2023. Ч. 2. — 176 с.: ил.
9. Епіскап Арцемій (Кішчанка): Пропаведзь на Дзень Усіх Беларускіх Святых [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.blagobor.by /article/preach/bel-saints . — Дата доступу: 27.10.2023.
10. Зорка Афанасія [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу:https://www.youtube.com/watch?v= IqcMnltvAjk&t=213s. — Дата доступу: 27.10.2023.
11. *Муравіцкая, А.* Духоўная спадчына святых і падзвіжнікаў беларускай зямлі [Электронны рэсурс] / А. Муравіцкая. — Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/195570/1/ . — Дата доступу: 26.10.2023.
12. Мученик за веру даже после смерти [Электронный ресурс]. — Режим доступа: nasledie/publikatsii https://www.obitel-brest.by/istoricheskoe-/muchenik-za-veru-dazhe-posle-smerti/ . — Дата доступа: 28.10.2023.
13. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай у адносінах да беларускай мовы [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://lektsii.org/6-79839.html. — Дата доступу: 28.10.2023.
14. По стопам преподобномученика Афанасия [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=cZZis9KxIbc&t=2s. — Дата доступа: 28.10.2023.
15. Румак: Брестская область — самый религиозный регион Беларуси [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.sb.by/articles/rumak-brestskaya-oblast-samyy-religioznyy-region-belarusi-.html. — Дата доступу: 29.10.2023.
16. Слава Табе, што паказаў нам Святло! Раждэственскае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://news.21.by /politics/2010/01/06/436152.html . — Дата доступу: 29.10.2023.
17. *Теплова, В.* Православие на землях Беларуси: страницы истории [Электронный ресурс] / В. Теплова. — Режим доступа: https://zapadrus.su/zaprus/tradbl/2407-pravoslavie-na-zemlyakh-belarusi-stranitsy-istorii.html . — Дата доступа: 28.10.2023.
18. *Чаропка, В.* Афанасій Філіповіч (1597—1648) [Электронны рэсурс] / В. Чаропка // Звязда. — 2019. — 30 ліп. — Рэжым доступу: https://zviazda.by/be/news/20190729/1564408016-afanasiy-filipovich-1597-1648 . — Дата доступу: 26.10.2023.

УДК 316.36.014

**Е. М. Булочкина**
*Государственное учреждение образования «Детский сад № 97 г. Могилева»,*
*Могилев, Республика Беларусь*

## ИНСТИТУТ СЕМЬИ В АСПЕКТЕ ПРОШЛОГО И РЕАЛИЯХ НАСТОЯЩЕГО

**Введение.** Семья является самым первым социальным институтом в жизни человека и самым длительным по времени нахождения в нем. Она образовалась раньше, чем государство и рыночные отношения. Семья — это малая социальная группа, ячейка общества, которая основана на браке и кровном родстве, а ее члены связаны общим бытом и ответственностью друг перед другом. Согласно иному определению, семья — это социальный институт, с помощью которого люди удовлетворяют важнейшие человеческие потребности.

Жизнь семьи — процесс сложный, поскольку основан на моральной ответственности, соблюдении нравственных норм. Одной из главных функций семьи является воспроизведение населения. Этнографы выделяют три эпохи в истории человечества: дикость, варварство и цивилизацию. Семейные отношения в процессе развития общества претерпевали ряд изменений: от беспорядочных половых связей до группового супружества, от матриархата до патриархата, а далее и до моногамии. В дохристианской модели семьи статус женатого человека был высоким, а женщина имела право вернуться в родительскую семью. Христианская модель основана на власти мужчины, который занимал первое место. Мать занималась детьми и домашними делами. Дети должны были безоговорочно слушаться родителей. В конце XIX начале XX веков учеными был отмечен кризис семьи, когда мужчина теряет власть. Однако и в настоящее время институт семьи терпит кризис. Стремительно растет количество разводов. Все чаще употребляется понятие «гражданский брак», когда мужчина

© Булочкина Е. М., 2024

Репозиторий БарГУ